Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 МАЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 98 (28208) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як смокінг стаў сямейным тэатрам



Сцэнарыі падарожжа на лета

ГЛУША Адамовіча

Ажыўшая памяць загаворыць

СТАР. 13

ЛІЧБА ДНЯ

**Br7 млн 85 тыс. 990**

*склала налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў у Беларусі ў красавіку 2016 года (у сакавіку бягучага года — Br7 млн 94 тыс. 521), паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у красавіку гэтага года складала Br7 млн 118 тыс. 128 (у сакавіку — Br7 млн 136 тыс. 393).*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 23° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 22° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19703,00 | ▼ |
| Еўра | 21965,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 299,03 | ▲ |
| Укр. грыўня | 785,29 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# «ЗЯЛЁНЫЯ» ДОЙЛІДЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі «зелянгаса» Кастрычніцкага раёна Мінска ствараюць кветкавую інсталяцыю з выявай Прывакзальнай плошчы сталіцы.

■ Працяг тэмы

## АРАНДАТАРЫ Ў СУЧАСНАЙ КАМУНАЛЦЫ:

### САЦЫЯЛЬНАЕ ЗЛО ЦІ ДЖЫН У БУТЭЛЬЦЫ?

**Чаму гаспадар не можа распараджацца жыллём па ўласным жаданні?**

**Недахоп грошай на асобную кватэру, падзел жылля паміж былымі сужэнцамі, жаданне зэканоміць, набываючы меншую плошчу, або наадварот — зарабіць, здаючы маёмасць у арэнду. Гэта бадай што асноўныя прычыны такой сітуацыі, калі ў краіне з'яўляецца ўсё больш камунальных кватэр, суладальнікамі якіх часта становяцца не проста незнаёмыя, а абсалютна супрацьлеглыя па ладзе жыцця людзі. Трапіць у камуналку даволі проста, а вось эксплуатаваць яе па ўласным жаданні бывае цяжка, а часам і немагчыма, пакуль у жыллёвым заканадаўстве краіны не зменяцца правы карыстання такімі памяшканнямі.**

Сёння, калі адзін з уласнікаў захоча здаць свой пакой у арэнду, ён павінен будзе атрымаць абавязковую згоду на гэта ад другога гаспадара жылля. Жыць у кватэры, прыводзіць гасцей, прадаць памяшканне (з першапачатковай прапановай суладальніку) ты права маеш. А вось для арэнды патрэбна згода суседа па камуналцы.

СТАР. 3

■ Медыцынская практыка

## НА ШТО ХВАРЭЭ... МАНЕКЕН?

**Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, чатыры медыцынскія ВНУ, 16 каледжаў і цэнтр павышэння кваліфікацыі будуць уключаны да 2020 года ў так званую сімуляцыйную адукацыю. Гэта сучасны сусветны падыход да адукацыі як урачоў, так і сярэдняга медперсаналу.**



Паводле слоў **начальніка ўпраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вольгі МАРШАЛКІ**, новы кірунак дапаможа, у першую чаргу, павысіць бяспеку для пацыентаў, знізіць магчымасць урачэбных памылак і ўскладненняў. Бо сёння медыкі авалодваюць тымі ж практычнымі навыкамі, галоўным чынам, каля ложка хворых. У той час як існуе магчымасць адпрацоўваць любыя маніпуляцыі, нават прыводзенне родаў, з дапамогай манекенаў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!